проза

Зьміцер Вішнёў



...хтосьці сьмяецца,

а нехта плача...

# Караваны слоў

*   *   *

Ты фарбаваная ў рудыя промні —
гэта, напэўна, паветраны помнік:
мне – адзіноце маёй, і, утрыруючы,
паведамляю, што скончыўся перыяд комы.
Я – адышоў ад калгасных песьняў, разумеючы,
што настаў новы дзень. Абломы
няхай застануцца пенсіянерам
і таленавітым версіфікатарам санетаў,
а сапраўдныя творы толькі калекцыянерам
промняў і ценяў, і старажытных манетаў.
Ты з вачыма — калодзежамі чорнымі —
спатоліш смагу спадарожніку зорнымі
водамі, кроплямі чарадзейнага сьвятла.
Зашамацяць паперы, дзе гуляюць у балет датла
філасофскія фабулы і кампазіцыі,
каб высьпявалі для кампазітара нотныя пазіцыі.

*8 сакавіка 2007*

* * *

па венах градус перапаўзае як гарачы Ташкент
раструшчыцца душы грэлка ўшчэнт
сьмяротным мячом паляціць
у каменную шліфаваную бездань
як ломкае печыва на стале
як самотны ўздых сталага чалавека
я ператвараюся ў сіні цень
і нагадваю самлелую квецень

*2007*

* * *

мой гучны рыпучы голас
абуджае зялёныя палосы
у зебру нараджаецца сусьвет
бо я люблю паэтавы кастэт
але ня б’ю насарогаў  і сланоў
некаторых дзяржаўных клапоў
адно – фігуры «без пантоў»
гэтых барвовых – усіх
і раблю гэта *тэт-а-тэт*
так – я антысавецкі дробнабуржуазны псіх
б’ю па паласатай калматай скуры
горы кладуцца на падлогу як мёртвыя куры

*сакавік 2007*

## КАРАВАНЫ СЛОЎ

Я пачынаю страляць з чырвонай вінтоўкі,
каб супакоіць нервы і злосны настрой.
Варта абраць для мішэні голаў сяброўкі,
якая крычыць пра жыцьцё, што гэта адстой.

Нешта ня тое, калі многа песьняў самотных
з белага неба ільецца на распараны твар.
Вечная сумесь у народных бутэльках балотных
Ціха шыпіць, заганяючы целы паэтаў у бар.

Моцныя тэмы ідуць на сталы грамадзянаў,
каб гадаваць алергічны настрой пад баяны
і выклікаць пачуцьцё традыцыйных забаў.

Я – за  вайну ў шматкроп'і асобна ўзятай краіны,
усе маніфесты, улёткі і лозунгі – як бедуіны —
рушаць далей, уздымаючы пырскі актаў.

*6 сакавіка 2007*

* * *

занатую на карціне палац вусяка
няхай атрымае алейнага бусяка

будзе ў яго маленькае сьвята – княства
значыць амарэта і гарэлка – п'янства

зрэшты якая розніца што з таго
у кожным выпадку хата з калонамі – ого!

будзе сядзець ён там быццам  цар
і пад гармонік песьню сьпяваць пра хазар

што і канапаў ня маюць і нават чыфіру
а толькі бутэльку кефіру

*2007*

* * *

кентаўры ідуць па нашых мокрых сьлядах
марская вада шліфуе жоўты пясок
расплываюцца дні і пырскае вішнёвы сок
на запацелы і празрысты дах

пах вандроўкі

*цягнік Варшава – Прага, 2007*

* * *

ляціць цягнік на Маравію
ды я лаўлю дэрыжаблікаў
лаўлю ды лаўлю
як  паветраных нерэальных зьвяркоў
горы і дрэвы схіляюцца
неба дрыжыць
нібы кісель
вясельнае покрыва напаўзае

каровай
якая ў сваю чаргу
ператвараецца ў гару-каравай
ляціць душа над зялёнай Маравіяй
перасыпае словы нібы мурашоў

*2007*

* * *

сьпякота ў галаве
думкі быццам скарпіёны
неба набывае крывавы колер
хтосьці сьмяецца а нехта плача
сьпякота — ад словаў сьпяваць з катам
але сьпякоту нагадвае і самлелы кот
мёртвы сок перапаўзае па венах нібыта ток

*29 мая 2007*

**Ха-ха**

13 мая — любімая дата...
13 мая я еду на літаратурны кангрэс ў Швецыю...
буду шпацыраваць па высьпе Готланд
буду слухаць мора
буду падпісваць кантракты на кнігі
буду пляваць на дэбілаў
будда на небе будзе ўсьміхацца міла

*9 мая 2007*

**Банкет**

***1.***

Запакую сваю думку ў куфар. Добрую ці дрэнную. Салодкую ці кіслую. Запакую нібыта падарунак. Схаваю. Нікому ня дам. Яна як закапаны скарб. Гэтая думка – патаемная манета. Вось такія паэтычныя сьпевы падчас недасыпу. Гэтыя словы нагадваюць піўную пену.

***2.***

Шукаю. Але знаходжу толькі вобраз і рыфму.
Я – на караблі сярод рыфаў. Гляджу праз бінокль – на даляглядзе вымалёўваюцца гарады мастацтва

***3.***

Я праціскаюся праз радкі і словы. Разьдзіраю лістоту вобразаў. На руках трафарэтамі праступаюць пакуты і радасьці.
Заплюшчваю вочы, каб пазбавіцца ад рэчаіснасьці. Здаецца – усё зьнікла... Асьцярожна расплюшчваю вока... потым другое... Не – усё на сваіх месцах. І пашараваная чорная шафа, і вэнджаны таршэр, і паласатая канапа. І тэлевізар з трохвокай пачварынай. Нават гліняны кот з адколатым носам гэтак жа хітра пазірае сваімі вадзяністымі вачыма.
Я падыходжу да люстэрка. Прыдзірліва дасьледую нямголены твар, выпукляю вусны, шкрабаю падбароддзе, адцягваю павекі... Выталупліваю вочы. Н-так. Яўна – непрыемны суб'ект, але для банкету – напэўна, ня самы горшы.

***4.***

Сёрбаю зялёную гарбату з кубка. Трушчу навакольную прастору на сонечныя жгуты ўспамінаў. Разважаю пра глупства.

***5.***

Сьмяюся. Ашчыляюся. Паказваю вострыя зубы. Хочацца напалохаць няздарных і нахабных. А іх многа. Варушацца каля дуба і жлукцяць жалуды. Ды на маіх пальцах блішчаць кроплі сярэбранай сьлюды!

***6.***

Шэпчаш. Шэпчаш пра шаленства гэтага сьвету. Нічога не паробіш – людзі шпацыруюць па струнах. Падаюць блазны. Уздымаюцца айсьбергі і рушаць далей.

***7.***

Растапырваю пальцы. Праз іх прабягаюць цені мінулага: твары сяброў і ворагаў, усьмешкі каханай, вочы маці, бацькавыя словы. Апускаю руку і ўсё застывае; пакрываецца ільдом і сьнегам.

Бліскучая, рыпучая, іскрыстая коўдра падае на мае плечы.

***8.***

Рэстаўраваць палотно пачуцьцяў… Для чаго? Каб пабудаваць новы калідор да аблокаў, дзе сярод калматых залатых зорак у сінім тумане плаваеш ты.

***9.***

Я папраўляю гальштук. Выдатна. Выгляд напраўду – банкетны.
Доўгі стол займае большасьць пакоя. Госьці ўжо сабраліся і нецярпліва паглядваюць на пачастунак. Пакашліваюць.
Гаспадар – апухлы і чырвоны ці ад хваляваньня, ці ад алкагольнага перапою – як маленькі катэр перасякае пакой уздоўж і ўпоперак, паціскае ўсім рукі і расплываецца ў бясконцых усьмешках.
Нарэшце нехта з прысутных не вытрымлівае:
— Давайце вып’ем за Альгерда!
— За мяне! За мяне! – быццам бы толькі гэтага і чакаючы, радасна падхоплівае гаспадар.
Звон кубкаў і кілішкаў. Вадкасьць перапаўзае са шкляных і парцалянавых паверхняў у мяккія вусны чалавечай субстанцыі. Тэрмометры вымяраюць градус патаемных трубаў.

***10.***

Я сплёўваю ў кубак рэчаіснасьці, абводжу прысутных вачыма. Сьвіньні. Ну, вядома, сьвіньні. Хто па нараджэньні, хто па прызваньні, а нехта па прымусу.
Гаспадар уключае музыку. Хрыплы голас сьпевака надрыўна выводзіць: «Тапаліны пух! Тапаліны пух! Тапаліны пух!»
На суседнім крэсьле падазрона выгінаецца самка.
— Му-у-уррр, — стогне яна.

***11.***

Ну, што схаваўся? Думаеш зьбегчы ў паперы, у кнігі? Ні фіга. Выкалупаюць цябе як блышку і пазногцямі расплюшчаць. Гэта – ня выйсьце, а прысуд самому сабе. Лепей выйдзі да людзей і прачытай ім Юры Станкевіча пра «рыбу Фугу». Магчыма тады некаторыя вырадкі задумаюцца.

Гэта ня значыць, што яны будуць лекавацца. Не. Але, прынамсі, недзея. Адно – надзея.

***12.***

У кубку плавае надзея. Я п’ю глыткамі. Першы глыток салёны, другі – кіслы і даўкі, а трэці… салодкі. Але чамусьці ад апошняга робіцца горай. Здаецца, горыч запаўняе ўвесь рот. Хочацца ванітаваць. Але нічога не атрымліваецца. Я задыхаюся.

***13.***

Крызіс. Ён сядзіць у кожным з творчых людзей. І аднойчы, як цеста – пухне, пухне. Дасягае памераў бохана. І раптам запякаецца. І тады еш! Колькі заўгодна паглынай гэтую субстанцыю. Прыйшоў крызіс.

***14.***

Зоркавая хвароба – вядзе творчага чалавека да сьмерці. Няхай не імгненнай, але лятальны зыход сядзіць перад вачыма наяўнай перспектывай. Агонія – гэта страшна. Сьмерць у пакутах мяне палохае.

***15.***

Сярод прамоваў музыкаў і мастакоў замнога сафістыкі. Ну, ня ўмееш ты размаўляць і даводзіць сваю думку праз сродкі прамовы – дык займайся тым, што добра робіш. Грай! Пішы карціны! А прамовы пакінь аратарам! Палітыкам і паэтам!

***16.***

Бі барабан! Бі! Хутка на банкеце будзе замнога трупаў! Уключацца пражэктары. У сьвятле промняў будуць нерухома ляжаць чырвоныя і белыя целы гасьцей. Бутэлькі і графіны будуць падобныя да гільзаў з-пад снарадаў і будуць яны качацца па чырвоным абрусе і грукатаць як пры стрэле з гарматы.

***17.***

Закусваю. І дзякуй богу. Можа не нап’юся. Дык можа не закусваць? Хочацца адурманіць галаву. Каб ня бачыць гэтага сьвету і гэтых сьвіных

рылаў. Варта самому ператварыцца ў сьвіньню і гучна рохкнуць. Можа, не закусваць?

***18.***

Напіцца і – на мароз! Тады, вядома, магчымае абмаражэньне. Там, глядзіш, не за гарамі і гангрэна. А там… Адным словам – файна. Халодная сьмерць. Я думаю, калі не ў жыцьці, дык у творчасьці часам трэба так рабіць. Лакалізацыя гангрэны – вартая хірургічная аперацыя ў мастацтве.

***19.***

Я б'ю відэльцам у вока таўстуну. Ён у адказ торкае лыжкай у пуза. Я дзіка раву. Таўстун вішчыць. Сьвіныя лычы сабраных мярцвеюць. Грукат відэльцаў заціхае. Зубы не рыпяць, кілішкі і кубкі падаюць на падлогу.

Мяне б'юць па галаве нечым цяжкім. Туман. Нябыт.

***20.***

Ён быў цудоўным чалавекам. Хаця часам і вылучаўся свалачызмам. Але ён паклаў сябе на алтар стала і сьведчаньнем таму ягоная няўмiручая паэзія. А клаунада? Толькі сапраўдны быў здольны на яе. А мы сьвіньні. Мы, вядома, сьвіньні, але мы яго разумеем. Няхай і пасьля ягонай сьмерці. Бо сьвіньні.

***21.***

Я ляжу нерухома. Ляжу на доўгім чырвоным стале. Вакол – чалавек трыццаць. Ці з поснымі тварамі, ці з вясёлымі? Ці з кілішкамі, ці з відэльцамі? І цяжка зразумець, што адбываецца – ці шабаш нячысьцікаў, ці сяброўская пасядзелка? А магчыма я ляжу на ўласным пахаваньні? А можа, я перапіў і ляжу на банкеце? А можа, я паранены і ў палаце лякарні? Ці, можа, жыцьцё, як таго і патрабуе душа звар'яцелага паэта, перакулілася разламаным караблём? І я, раптоўна, памёр? Дык навошта гэтыя бліскучыя срэбныя відэльцы, гэтыя зьмяіныя нажы, гэтыя залатыя зубы і злыя зьвярыныя вочы? Навошта гэтыя платаядныя усьмешкі?

*2007*